# Чутны крок у галерэі

**Больш як сотня работ жывапісцаў, фотамастакоў, майстроў акварэлі размясцілася ў трох выставачных галерэях Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі — "Лабірынт", "Атрыум" ды "Ракурс". Гэта пераважна зусім новыя творы, прадстаўленыя чальцамі грамадскага аб'яднання "Міжнародная гільдыя жывапісцаў" у межах традыцыйнага штогадовага праекта "Арт-крок".**











Старшыня Міжнароднай гільдыі жывапісцаў, загадчык галерэйна-выставачнага комплексу мастак Фёдар Ястраб добра памятае першы "Арт-крок". Здзейснены ён быў у снежні 1999-га, калі самыя паспяховыя беларускія майстры ды іх маладыя калегі, што працуюць на памежжы розных відаў і жанраў творчасці, наладзілі яскравую калядную выстаўку ў сталічным Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.

Мінула 10 гадоў. Дзякуючы таму, што ля цэнтральнай магістралі Мінска паўстаў такі гігант айчыннага дойлідства, як Нацыянальная бібліятэка, у нашых творцаў (шмат у чым дзякуючы энтузіязму і арганізатарскаму таленту іх калегі Фёдара Ястраба) з'явілася магчымасць асвойваць новую выставачную прастору. У беларускім культурным асяроддзі распаўсюджваецца цяпер не толькі водгулле арт-крокаў, што кожную зіму гучаць у галерэях бібліятэкі, а і добры розгалас іншых крэатыўных праектаў Міжнароднай гільдыі жывапісцаў, такіх напрыклад, як "Арт-лінія" (выстаўка і конкурс графічных работ), біенале жывапісу, "Universum"...

Чарговая выстаўка "Арт-крок", што адкрылася на пачатку снежня мінулага года, будзе працаваць да 12 студзеня. Экспазіцыя адлюстроўвае новыя творчыя крокі знаных прафесіяналаў і дазваляе заўважыць адметную хаду тых маладых мастакоў, якія ўжо выявілі сваю індывідуальнасць. Васіль Касцючэнка, Мікола Кірэеў, Сяргей Малішэўскі, Алесь Забаўчык, Уладзімір Кожух, Зоя Луцэвіч, Барыс ды Іван Сямілетавы, Георгій Паплаўскі, Фёдар Ястраб, Зміцер Сурыновіч, Каміль Камал, Уладзімір Ісачанка, Аляксандр Грышкевіч, Уладзімір Дзядзюля, Вера Джукіч, Уладзімір Шчаўкун, Віталь Губараў, Сяргей Кажамякін, Аляксандр Некрашэвіч... Дастаткова і гэтых прозвішчаў (а калі назваць усіх удзельнікаў праекта, іх будзе амаль паўсотні!), каб дасведчаны чытач зразумеў, наколькі розныя — здавалася б, несумяшчальныя ў адной прасторы, — мастакі прадстаўленыя на выстаўцы і наколькі гэта цікава.

**Лана ІВАНОВА**

***На здымках: творы, прадстаўленыя ў экспазіцыі.***

*Фота Віктара Кавалёва*